# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 1(55) 2008**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія


Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь


***Галоўны рэдактар***

П. Дз. Кухарчык

***Рэдакцыйная калегія:***

В. В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
А. П. Жытко
М. М. Забаўскі
Л. М. Каранеўская (*адк. сакратар*)
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
Н. І. Кунгурава
А. М. Люты
У. А. Мельнік
А. І. Смолік
С. В. Снапкоўская
А. С. Цернавы
В. В. Шынкароў


## Змест


***Гісторыя***

*Сакалоў М.К.* Станаўленне аспіранцкай формы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у вышэйшых навучальных установах Беларусі ... 3

*Пуцік У.С.* Нацыянальнае пытанне ў праграмах і дзейнасці палітычных партый на тэрыторыі Беларусі (на мяжы XIX–XX ст.) ... 6

*Волкава В.А.* Дзейнасць Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага аддзяленняў Саюза раўнапраўя жанчын у гады Першай расійскай рэвалюцыі ... 10

*Крывіцкая К.В.* Камісія Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага: стварэнне і склад ... 13

*Зданкевіч К.В.* Судовая рэформа 1864 г. у Беларусі: гістарыяграфія праблемы ... 16

*Кадзіра У.М.* Прыгонніцкі ўціск і антыфеадальная барацьба беларускага і ўкраінскага народаў у другой палове XVI – 30-я гг. XVII ст.: аналіз археаграфіі ... 19

*Люты А.М., Кадзіра У.М.* Генезіс і эвалюцыя казацтва Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – XVI ст. ... 21

*Вялікі А.Ф.* Беларуска-польскія ўзаемаадносіны ў знешняй палітыцы СССР у сярэдзіне 40 – другой палове 50-х гг. XX ст. ... 25

*Важнік В.М.* Эканамічныя, навукова-тэхнічныя і культурныя сувязі БССР і ПНР у 1949–1979 гг. ... 29

*Гайдукевіч Л.М.* Малыя гістарычныя гарады як аснова развіцця турызму ў рэгіёнах Беларусі ... 32

*Старычонак В.В.* Месца амерыканскай грамадскай думкі і Кангрэса ЗША ў адносінах да пытання аб прымяненні Злучанымі Штатамі сілы ў 1990–1995 гг. ... 36

*Субоцін А.Г.* «імперская рэформа» ў Трэцім рэйху (1933–1934 гг.) ... 42

***Філасофія***

*Красюк У.Ф.* Макс Планк на фоне эпохі ... 46

*Шымбалёў А.А.* Астралогія і рэпрэзентацыя рэальнасці ... 48

*Стаховіч Т.В.* Эстэтычныя пошукі ў творчасці кампазітара Вячаслава Кузняцова ... 52

***Паліталогія***

*Сіманоўскі С.І.* Артыкуляцыя інтарэсаў у палітычнай сістэме грамадства ... 57

*Скок Н.У.* Палітычная культура: узроўні і структура ... 61

*Юройць К.П.* Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі ў канцы XIX – першай чвэрці XX ст. ... 63

*Новікава С.І.* Развіццё ідэй і ўяўленняў аб праве І справядлівасці: ад антычнасці да праектаў сацыялістаў-утапістаў ... 67

*Адрас рэдакцыі:*
220007, Мінск,
вул. Магілёўская, 37,
пакой 124,
тэл. 219-78-12
*e-mail*: vesti@bspu.unibel.by

Пасведчанне № 2288
ад 08.02.05.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 14.03.08
Фармат 60×84 1/8.
Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял.*
Друк Riso.
Ум. друк. арк. 13,02.
Ул.-выд. арк. 13,97.
Тыраж 100 экз.
Заказ 135.

*Выдавец*
*і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка».
Ліцэнзія № 02330/0133496
ад 01.04.04.
Ліцэнзія № 02330/0131508
ад 30.04.04.
220050, Мінск, Савецкая, 18.
*e-mail*: izdat@bspu.unibel.by

*За дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары*

*Рэдактар*
Л. М. Каранеўская

*Тэхнічнае рэдагаванне*
І. І. Галіцкага

*Камп'ютэрная вёрстка*
І. І. Галіцкага

© Весці БДПУ, 2008. № 1. Серыя 2

### *Сацыялогія*

*Кавалевіч М.С.* Асобаснае і прафесійнае станаўленне студэнцкай моладзі ў аспекце тэорыі сацыяльнай самаарганізацыі ........ 71

*Гажэўская Т.С.* Духоўнасць як фактар выхавання эстэтычных густаў моладзі: сацыялагічны аспект ........ 74

*Мудроў С.А.* Рэлігія і Еўрапейскі саюз: пратэстанцкі і каталіцкі погляд на еўрапейскую інтэграцыю ........ 77

### *Эканоміка*

*Давыдзенка Л.М., Міхальчук Гражына.* Ацэнка еўрапейскіх сістэм вымярэння інтэлектуальнага капіталу ........ 82

*Запольская Л.У.* Эканамічнае і арганізацыйнае рэфармаванне ў адукацыі Рэспублікі Беларусь ........ 86

*Гараева С.С.* Інавацыйная дзейнасць у рэгіёне: сутнасць і змест сістэмаўтваральных паняццяў ........ 89

*Жук В.І.* Фарміраванне сферы спажывання ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў перыяд сістэмнай трансфармацыі ........ 92

### *Культуралогія*

*Снапкоўская С.В.* У сілавым полі гамінізацыі: да праблемы станаўлення культуралагічнай персаналогіі ........ 95

*Рагуля А.У.* Духоўныя і сацыяльныя ідэалы беларускай культуры ва ўмовах сучаснай постмадэрнасці ........ 97

*Павільч А.А.* Праблема ўзаемадзеяння традыцый і інавацый у сучаснай інфармацыйнай прасторы ........ 99

*Праскаловіч В.У.* Мадэль «этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе ........ 101

*Вараб'ёва В.А., Сухоцкая Т.Ф.* Культуралагічны практыкум у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў ........ 103

*Гарошка Н.С.* Эвалюцыя «гульні» ў сучасным гісторыка-культурным працэсе ........ 104

**Рэфераты** ........ 107

**В.І. Жук,**
*магістр эканамічных навук, выкладчык кафедры эканамічнай тэорыі і кіравання (УА «Палескі дзяржаўны універсітэт»)*

# ФАРМІРАВАННЕ СФЕРЫ СПАЖЫВАННЯ Ў КРАІНАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ Ў ПЕРЫЯД СІСТЭМНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ

Канец 80-х гг. XX ст. у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (ЦУЕ) характарызаваўся радыкальнымі зменамі, якія ахапілі фактычна ўсе сферы грамадскага жыцця. Перш за ўсё, гэтыя змены закранулі эканамічныя і сацыяльныя асновы грамадства, бо сацыялістычная сістэма, якая больш за 40 гадоў панавала ў краінах рэгіёну, аказалася не ў стане забяспечыць стабільны эканамічны рост, а таксама ўзровень жыцця, які адпавядаў бы ўзроўню ў развітых краінах з рынкавай эканомікай.

Стала відавочнай неабходнасць радыкальных сацыяльна-эканамічных змяненняў, бо захаванне старой, цэнтралізавана рэгулюемай эканамічнай сістэмы, нават з уключэннем у яе рынкавых элементаў, ужо было немагчыма. Рэформы павінны былі закрануць фундаментальныя складальныя эканамічнай сістэмы, у тым ліку спажывання.

Рынкава-арыентаваныя рэформы ўключаюць у сябе тры важнейшыя напрамкі эканамічнай палітыкі: лібералізацыю, фінансавую ста-

білізацыю і інстытуцыянальныя пераўтварэнні. І калі перыяд рэалізацыі першых двух параўнальна непрацяглы, то здзяйсненне апошняга займае адносна працяглы тэрмін. У аб'ёме спажывання краін Цэнтальнай і Усходняй Еўропы ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. адбыліся істотныя змяненні (рысунак).




**Рысунак – Дынаміка асабістага спажывання (1996=100, пастаянныя цэны) у 2003 г.**

*Заўвагі:*

1. Крыніца: Informacja o sytuacji gospodarczej kraju. I kwartal 2004, GUS. – Warszawa, 2004.
2. Распрацоўка аўтара.

Аднак некаторыя краіны дадзенага рэгіёну не могуць параўнацца з узроўнем спажывання ў высокаразвітых краінах, дзе назіраецца больш высокі ўзровень спажывання даброт і паслуг. Згодна са статыстычнымі данымі, ён складае каля 60–80% у высокаразвітых краінах, у той час як у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы – толькі 10–40% [4, с. 136].

Асноўныя прычыны склаўшайся сітуацыі трэба шукаць у дыферэнцыраваным уздзеянні фактараў, якія фарміруюць спажыванне ў асобных краінах былога Усходняга блока і ў высокаразвітых краінах. Да такіх фактараў можна аднесці эканамічныя, псіхалагічныя, дэмаграфічныя, грамадскія, а таксама біялагічныя, экалагічныя і культурныя. Яны абумоўліваюць напрамкі змяненняў у сферы спажывання і вызначаюць эвалюцыю дадзенай сферы ў будучыні.

Сярод дэтэрмінант спажывання ва ўсіх краінах былога СССР найбольш паўплывалі эканамічныя фактары. Сярод іх выдзяляюцца даходы хатніх гаспадарак, цэны даброт і паслуг (узровень інфляцыі), узровень захавання, доступ да крэдытаў, валоданне дабротамі працяглага карыстання і іх стан.

Укараненне рыначнай эканомікі стала прычынай з'яўлення новых перспектыў і пагроз у спажыўцоў. Аналіз змяненняў у структуры расходаў можа сведчыць аб рэакцыі хатніх гаспадарак, выкліканай змяненнямі ўзроўню даходаў, цэн і іншымі пазаэканамічнымі фактарамі.

У перыяд пераходу да рынку ўзнік спажывецкі энтузіязм як рэакцыя на магчымасць набыцця раней недаступных тавараў пасля працяглага перыяду дэфіцыту. Напрыклад, у Польшчы ў 1989 г. доля спажывецкіх расходаў павялічылася на 1,8% у параўнанні з папярэднім годам, у якім быў зафіксаваны самы нізкі ўзровень за 11 гадоў. У 1990 г. доля расходаў на харчаванне ў спажывецкіх расходах вырасла на 0,6%. З 1990 г. наступіла зніжэнне долі спажывання ў агульных бюджэтах хатніх гаспадарак. У пачатку пераходу гэты ўзровень склаў больш за 50%, у сярэдзіне 90-х гг. – менш чым 40%, а ў 2002 г. – усяго 30,7%. Узровень расходаў на харчаванне ў агульных расходах паменшыўся амаль да 22% у 2002 г. у параўнанні з 1990 г. (у рабочых сем'ях – больш за 22%, у фермерскіх гаспадарках – да 13%, а ў пенсіянераў – 27%) [3].

У працэсе трансфармацыі эканомік краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы змянілася і стала больш рацыянальнай структура спажывання: паменшылася спажыванне збожжавых культур, жывёльных тлушчаў і малака, больш спажывалася гародніны, рыбы, цукру і садавіны [3].

Прыкладна ў сярэдзіне 90-х гг. адбыўся зрух спажывецкага попыту ў напрамку непрадуктовых тавараў, у той час як доля расходаў на харчаванне падлягала сістэматычнаму змяншэнню пры адначасовым захаванні хатнімі гаспадаркамі мадэлі спажывання, арыентаванай на харчаванне. Гэты працэс не азначаў павелічэння спажывання высакаякасных тавараў і паслуг, а толькі пераразмеркаванне сродкаў на іншыя абавязковыя расходы, на тавары першай неабходнасці: на кватэрную плату, вучобу і ахову здароўя. Збядненне хатніх гаспадарак прымусіла абмежаваць расходы на прадуктовыя тавары з мэтай эканоміі сродкаў на задавальненне першасных патрэб, сярод якіх самай важнай стала аплата жылля. Такая эканомія дасягалася за кошт адмовы ад набыцця іншых даброт і паслуг. У перыяд трансфармацыі эканомік грамадства вымушана было перайсці на самазабеспячэнне, у той час як дзяржава пачала адыходзіць ад даціравання многіх прадуктаў (перш за ўсё прадуктаў харчавання) і паслуг (аплата камунальных плацяжоў, дзіцячых садоў і г. д.). Гэта азначала, што хатнія гаспадаркі сталі самастойна прымаць эканамічныя рашэнні.

Перыяд сістэмных змяненняў характарызуецца зніжэннем долі расходаў хатніх гаспадарак на паслугі. Дадзеныя неспрыяльныя змяненні сталі адлюстраваннем матэрыяльнай сітуацыі грамадства, неабходнасцю здзяйснення змяненняў у расходах на паслугі і хутка растучых цэн на іх. Усё больш набывалі значэнне паслугі, якія задавальняюць патрэбы развіцця асобы. У выніку павялічваліся расходы на адукацыю і выха-

ванне (курсы, забеспячэнне жыллём моладзі, студэнтаў і інш.), на культуру і мастацтва (расходы на музычную творчасць і інш.), на павышэнне кваліфікацыі, што было выклікана канкурэнцыяй на рынку працы і прымусіла многія хатнія гаспадаркі адмовіцца ад іншых патрэб з мэтай інвесціравання ў адукацыю.

Эканамічныя фактары адносяцца да галоўных фактараў, якія ўплываюць на абмежаванне магчымасці рэалізацыі спажывецкіх запытаў. У гэтай групе фактараў можна выдзеліць даходы хатніх гаспадарак, цэны даброт і паслуг, а таксама валоданне таварамі працяглага карыстання. Важным фактарам змянення можа быць таксама эканамічная сітуацыя ў краіне, а менавіта кан'юнктура і ўдзеянне дзяржавы на дадзеную сферу чалавечай дзейнасці.

У эпоху апошніх змяненняў, якія адбываюцца ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, галоўным рухавіком дзейнасці хатніх гаспадарак стала дасягненне матэрыяльнага дабрабыту і выраўноўванне эканамічных адрозненняў паміж грамадствам краін Заходняй і Усходняй Еўропы. Змены ў галіне даходаў зменшылі дыстанцыю ва ўзроўні жыцця насельніцтва, якая аддзяляла ўсходнееўрапейскія краіны ад краін высокаразвітых, а таксама гэтыя краіны адну ад адной. Пры нізкіх даходах спажыўцы імкнуцца да задавальнення неабходных патрэб (харчаванне, жыллё, адзенне, абутак). У выніку павелічэння даходаў усё большая іх частка адводзіцца на куплю тавараў больш высокага парадку (даброты працяглага карыстання) ці прадметаў раскошы.

Павелічэнне даходаў не толькі прыводзіць да павелічэння расходаў на даброты і паслугі, але і ўплывае на змяненне іх структуры. У выніку гэта прыводзіць да павелічэння долі агульных расходаў, адведзеных на куплю даброт больш высокага парадку, і памяншчэння расходаў на куплю даброт больш нізкага парадку.

Праведзены аналіз паказаў, што хатнія гаспадаркі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы не валодаюць такой колькасцю сучаснай бытавой тэхнікі як высокаразвітыя краіны.

Паводзіны спажыўцоў у дадзеных краінах вызначаюцца ўзроўнем нацыянальнага даходу дадзенай краіны. Высокі ўзровень ВНП на душу насельніцтва прыводзіць да павелічэння расходаў на тавары працяглага карыстання, у тым ліку прадметамі раскошы, і ў той жа час памяншэння расходаў на тавары першай неабходнасці.

Аналізуючы змяненні паводзін спажыўцоў краін Усходняй Еўропы на працягу апошніх гадоў, можна заўважыць тэндэнцыю памяншэння расходаў на прадукты харчавання і павелічэння расходаў на прамысловыя тавары і паслугі. Дадзеныя краіны, згодна са статыстычнымі данымі, адстаюць ад высокаразвітых краін Заходняй Еўропы і ЗША. Паміж імі назіраецца істотная розніца ва ўзроўні структуры спажывання хатніх гаспадарак.

Такім чынам, на змяненні, якія адбываюцца ў хатніх гаспадарках, паўплывалі перш за ўсё эканамічныя фактары. Даходы хатніх гаспадарак, цэны даброт і паслуг, стан і колькасць даброт і паслуг, якія знаходзяцца ў распараджэнні хатніх гаспадарак, даступнасць даброт, а таксама ўзровень развіцця эканомікі краіны ў большай ступені вызначалі паводзіны спажыўцоў у асобных краінах.

### *Літаратура*


1. *Dabrowska, A.* Struktura konsumpcji w Polskich gospodarstwach domowych w latach 1990–2000 na tle krajow Unii Europejskiej w: Studia i Prace Kolegium Zarzadzania i Finansow. – SGH, Warszawa, 2002. – № 28. – S. 136–137.
2. *Bienkowski, W., Grabowiecki, J., Wnorowski, H.* Wspolpraca trangraniczna Polski z krajami Baltyckimi, Bialorusia i Rosja + Obwsd Koliningracki w warunkach integracji z UE. – Bialystok, 2004.
3. Rocznik Statystyczny RP, GUS. – Warszawa, 2003.
4. Rocznik Statystyki Miedzynarodowej 2003, GUS. – Warszawa, 2003.



### Summary

*In sphere of consumption of central and the eastern Europe countries of last decades of XX$^{th}$ century essential changes have occured. Economic, psychological, demographic, public and also biological, ecological and cultural factors cause directions of changes in the sphere of consumption and will define the evolution of the given sphere in the future.*